УДК 94(476)“15”

*Ю.Ф. УСЦІНОВІЧ*

# УТРЫМАННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ ЗАМКАЎ У ВКЛ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI ст.

*Сістэма ўтрымання дзяржаўных умацаванняў у ВКЛ эфектыўна функцыянавала да канца XV ст. Паступова пачалі нарастаць негатыўныя з'явы, а да сярэдзіны XVI ст. сістэму спасціг крызіс. У артыкуле разглядаюцца мерапрыемствы ўрада ВКЛ, накіраваныя на пераадоленне гэтага крызісу. Аналіз матэрыялаў дазваляе прыйсці да высновы, што цэнтральная ўлада не здолела выпрацаваць належных мер па вырашэнні гэтага пытання да канца XVI ст.*

## Уводзіны

Утрыманне ўмацаванняў у ВКЛ грунтавалася на тым, што асноўныя намаганні ўскладваліся на мясцовае насельніцтва. Дзяржава таксама ўдзельнічала ў іх утрыманні, аднак яе выдаткі былі нерэгулярнымі. У розных землях ВКЛ абавязкі насельніцтва на карысць замкаў адрозніваліся, бо залежалі ад асаблівасцяў даўніны.

Заняпад сістэмы ўтрымання замкаў паказалі рэвізіі, праведзеныя ва ўсёй дзяржаве ў 1545 г. [1, с. 44]. З тых рэвізій захаваліся апісанні паўднёвых замкаў. Яны выявілі нізкі стан баяздольнасці фартэцый [2, с. 514-515].

У пэўнай ступені вінаватымі былі намеснікі-дзяржаўцы. Яны занядбалі свае абавязкі і прысвоілі замкавыя даходы. Апроч таго, не хацелі зважаць на тое, што

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з уладанняў мясцовых феадалаў спынілася выкананне абавязкаў на ўмацаванні. Але галоўнай прычынай заняпаду фартэцый сталі злоўжыванні феадалаў, асабліва арыстакратыі [2, с. 515].

Яшчэ адной праявай крызісу стала адбудова ў 1551 г. замка ў Браслаўлі. Ухіленне мясцовай шляхты ад пасылкі сваіх падданых на будаўнічыя работы мела масавы характар. Вялікі князь быў вымушаны аддаць загадураднікам, якія вядуць будаўніцтва, чыніць над уладаннямі такіх феадалаў рабаванні, каб атрыманыя сродкі накіроўваць на будаўніцтва [3, s. 69-70]. Тым не менш, асноўныя выдаткі леглі на гаспадарскі скарб [4, с. 228-229].

**Асноўная частка**

Крызіс сістэмы ўтрымання замкаў ва ўсім ВКЛ быў выкліканы, па-першае, тым, што назбіралася шмат зменаў у даўніне, якія прыводзілі да блытаніны ў выкананні абавязкаў на карысць умацаванняў; па-другое – скарачэннем дзяржаўнага зямельнага фонду, бо памяншаліся паступленні ў скарб і, адпаведна, змяншаліся магчымасці выдаткоўваць сродкі на замкі; па-трэцяе – стратай зямель на ўсходніх межах, бо з іх спынялася выкананне замкавых абавязкаў, таму ўзнікала патрэба ў павелічэнні датацый з боку скарбу; па-чацвёртае – свавольствамі феадалаў, якія, карыстаючыся слабасцю цэнтральнай улады, спынялі выкананне абавязкаў на карысць замкаў.

Яшчэ напачатку другой паловы XVI ст. урад прымаў меры, каб павялічыць паступленні ў скарб і, адпаведна, палепшыць забеспячэнне замкаў. Прызначэнне самой аграрнай рэформы было ў павелічэнні даходнасці ад гаспадарскіх уладанняў. На землях, дзе яна праводзілася, выкананне рамонтна-будаўнічых работ на замак арганізоўвалася так, што з 3-4 валок абіраўся адзін працаўнік. Ён забяспечваўся ўсім неабходным. За адбыванне павіннасці прадугледжвалася зніжэнне падаткаў. А рамеснікі, што былі пры замках, за нясенне службы надзяляліся адной валокай зямлі. Ураднікам забаранялася выкарыстоўваць замкавых рамеснікаў у сваіх мэтах [1, с. 87-88].

Аднастайны падыход да выканання рамонтна-будаўнічай павіннасці ў параўнанні з папярэдняй традыцыяй даўніны дазваляў пазбегнуць блытаніны. Аднак валочная памера была праведзена пераважна ў заходніх і цэнтральных землях ВКЛ. Але, зыходзячы з геапалітычнага становішча, менавіта на ўсходніх землях патрабавалася ў першую чаргу паляпшаць баяздольнасць замкаў. Акрамя таго, валочная памера не паспела прынесці істотных вынікаў да моманту, калі рэзка ўзраслі выдаткі на Інфлянцкую вайну.

Урад спрабаваў ужыць новы падыход падчас адбудовы замка ў Тыконе ў 1569 – 1570 гг. Планавалася замест традыцыйнай пасылкі на работы падданых сабраць з кожнай валокі на патрэбы будоўлі па 8 грошай. На атрыманыя сродкі ўрад збіраўся наняць рабочых. Аднак ажыццявіць план не атрымалася, бо замак трэба было ўзводзіць хутка, а за кароткі час наняць працоўную сілу было немагчыма [5, p. 60-61].

На працягу другой паловы XVI ст. узрасла колькасць злоўжыванняў з боку ўраднікаў у адносінах да абавязкаў па наглядзе за станам замкаў і да насельніцтва ўвогуле. Каб супрацьдзейнічаць злоўжыванням, урад прызначыў скарбавых пісцоў назіраць за дзейнасцю ўраднікаў. Скарбавыя пісцы не толькі мусілі сачыць за станам умацаванняў, але кантралявалі, каб на месцах не чынілася бяспраўе насельніцтву [6, с. 264].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У 1566 г. абавязак нагляду за памежнымі ўмацаваннямі быў ускладзены на гетмана [2, с. 793; 4, с. 275]. Але на паляпшэнне стану ўмацаванняў такі падыход не мог паўплываць, бо ён не ліквідаваў недахопаў самой сістэмы ўтрымання замкаў.

Рост колькасці злоўжыванняўураднікаў прымусіў гаспадара накіраваць у 1567 г. рэвізора Івана Валовіча ў паўднёвыя і некаторыя ўсходнія землі ВКЛ. Яму загадвалася правесці агляд замкаў, зафіксаваць павіннасці, разгледзець скаргі ад жыхароў. Прадстаўляючы даклад гаспадару, Іван Валовіч адзначаў, што насельніцтву чыняцца крыўды ад намеснікаў-дзяржаўцаў і прызначаных ад іх служэбнікаў. Але разгляд спраў аб парушэннях немажлівы. Самі ўраднікі ўдзельнічалі у паспалітым рушэнні, а прызначаныя ад іх служэбнікі прыкрываліся неправамоцнасцю і адмаўляліся чыніць справядлівасць. Да таго ж высветлілася, што насельніцтву робяцца перашкоды ў падачы скаргаў на адміністрацыю. Гаспадар быў вымушаны зноў накіраваць Івана Валовіча, а ўраднікам настойліва наказвалася прымусіць сваіх служэбнікаў чыніць справядлівасць у адносінах да гаспадарскіх падданых і не забараняць ім падаваць скаргі рэвізору [6, с. 264].

Каб палепшыць забяспечанасць харчаваннем паўднёвых замкаў, урад надаваў права мяшчанам бязмытнага правозу жыўнасці да сваіх гарадоў [7, с. 35, 65, 209-210]. Але цэнтральная ўлада не здолела супрацьдзейнічаць з'яўленню незаконных мытняў, устаноўленых асобнымі феадаламі [6, с. 412-413]. Насуперак гаспадарскім прывілеям на такіх мытнях з мяшчан прымусова спаганяліся падаткі. У выніку гарадскі гандаль прыходзіў у заняпад, а гэта пагаршала забяспечанасць замкаў узбраеннем, бо ў некаторых гарадах артылерыя гарнізонаў утрымлівалася за кошт даходаў з гандлю [8, с. 76; 9, с. 199-200].

Увогуле, можна казаць, што рэвізіі замкаў, фіксацыя абавязкаў, чыненне гаспадарскімі рэвізорамі справядлівасці насельніцтву ўжо не маглі палепшыць сітуацыю з утрыманнем замкаў. Паглыбляла праблему і Інфлянцкая вайна. Былі спустошаныя значныя тэрыторыі, а ўрад з-за хранічнага недахопу сродкаў не мог пакрыць скарачэнне павіннасцяў і службаў на карысць замкаў ад насельніцтва. Таму гаспадар, звяртаючыся ў 1571 г. да паноў-рада, указваў, што трэба вырашыць, якія замкі ў Полацкай зямлі пакінуць. Астатнія неабходна знішчыць, бо ўтрымліваць усе існуючыя замкі скарб быў не ў стане [10, р. 157].

Урад імкнуўся засноўваць пры замках мястэчкі. Калі мястэчкі станавіліся шматлюднымі, на іх жыхароў можна было перакласці большыя абавязкі па ўтрыманні замкаў.

У 1555 г. кіеўскі ваявода ўзвёў замак у Белай Царкве. Каб заахвоціць прыток пасяленцаў, гаспадар на 10 год вызваляў жыхароў новага мястэчка ад розных выплат і работ на карысць замка [11, с. 52-53]. Гэтаксама з узвядзеннем умацаванняў у Суражы пры ім асаджвалася мястэчка [12, р. 155]. На зацікаўленасць урада ў існаванні пры памежных замках мястэчак гаворыць тое, што нязначныя, у параўнанні з Віцебскам, Сураж і Ула набываюць права на самакіраванне па віцебскім узоры. Сураж – у 1570 г. [1, с. 155-157], а Ула – у 1577 г. [13, с. 208-210].

Адну з прычын надання ў 1580 г. Полацку на 8 год ільготы на выкананне падаткаў, выплату мытных збораў і вызваленне на вечнасць ад штогадовай выплаты гаспадару 200 коп грошай [1, с. 256, 258] таксама трэба бачыць у імкненні ўрада найхутчэй аднавіць колькасць мяшчан. А ў прывілеі Азярышчу, які вызваляўся на 8 год ад розных выплат і падаткаў, у тым ліку і ад павіннасцяў на замак, прама ўказваецца, што ўрад зацікаўлены “абы при томъ замку нашомъ местечко забудовати и осадити се могло” [1, с. 277].

Падыход, калі цяжар падтрымання баяздольнасці замка практычна цалкам ускладаўся на насельніцтва мястэчак, лепш за ўсё бачны на прыкладзе Дзісны.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Мяшчане Дзісны мусілі не толькі ўдзельнічаць у будаўніцтве астрога і вежаў, але і кантраляваць гэты працэс, абраўшы са свайго асяродку прыставаў. Акрамя высілкаў і выдаткаў на будаўніцтва ўмацаванняў, нагляду за аховай іх ад агню, нясення варты на вежах, удзелу у палявой варце дзісенскія мяшчане мусілі набываць для сябе ахоўную і наступальную зброю. Да ўсяго гэтага, яны набывалі агністрэльную зброю і порах для гарнізона замка. А падчас варожай аблогі мяшчане павінны былі браць удзел у абароне Дзісны пад уладай старасты [12, р. 227-228; 13, с. 166-167].

Пасля страты Полацка для ўрада было вельмі важным заснаванне новага моцнага замка ў Дзісне. Таму ўлада імкнулася зацікавіць жыхароў пасяляцца ў новым мястэчку, бо вялікі аб'ём абавязкаў на карысць замка магла выконваць толькі дастатковая колькасць мяшчан. Жыхары Дзісны павінны былі валодаць вялікімі сродкамі, каб забяспечыць зброяй і боепрыпасамі сябе і гарнізон. Таму ў 1566 г. гаспадар даў ім вольнасць ад выплатаў капшчыны тэрмінам на 8 год. Акрамя таго, яны на такі ж тэрмін вызваляліся ад старых і новых гандлёвых падаткаў у межах ВКЛ [14, с. 106-108; 15, с. 274-275].

Але нават такія значныя льготы не маглі цалкам пакрыць выдаткі мяшчан на ўтрыманне замка. Выконваючы абавязкі на яго карысць, мяшчане абцяжарыліся шматлікімі пазыкамі. Гаспадар, маючы на ўвазе важнасць справы арганізацыі належнай баяздольнасці Дзісны і ўлічваючы тое, што яе жыхары добрасумленна выконвалі ўсе патрабаванні, надаў ім часовае вызваленне ад прэтэнзій крэдытораў па ўсёй дзяржаве. Трэба адзначыць, што жыхары Дзісны і самі імкнуліся да належнай арганізацыі абароны. Менавіта ад іх зыходзіла ў 1569 г. ініцыятыва, каб пасля заканчэння тэрміну вольнасці ад нявыплаты падаткаў яны паступалі не да скарбу, а ішлі на забеспячэнне ўмацаванняў Дзісны зброяй. Гаспадар з такой просьбай пагадзіўся [13, с. 168].

Каб узмацніць баяздольнасць памежных замкаў, урад пачаў патрабаваць ад жыхароў мястэчак і гарадоў трымаць у сваіх дамах зброю. Устава мяшчанам Магілёва ад 1561 г. прадпісвала мець у дамах "стрелбу всякую, то есть, гаковницы, ручницы и сагойдаки и иншую оборону, то есть, рогатины и што иного къ той обороне належитъ". Бяднейшай частцы мяшчан дазвалялася мець адну ручніцу і рагаціну. Пражываць без зброі забаранялася [1, с. 112]. Такая ж забарона пражываць без зброі ўскладалася і на мяшчан Оршы [13, с. 252].

Аднак узор Дзісны з ускладаннем практычна ўсяго цяжару па ўтрыманню ўмацаванняў на мяшчан скарыстоўваўся не паўсюдна. Урад не мог ужыць падобны падыход да адваяванага ў 1579 г. Полацка, бо колькасць яго жыхароў была непараўнальна меншай з перыядам да 1563 г. На жыхароў памежнага Азярышча ўрад таксама не мог ускласці такі цяжар абавязкаў на карысць замка, калі жадаў, каб у небяспечным ад варожых нападаў месцы хутчэй узрасла колькасць жыхароў. Таму, наадварот, мяшчанам Полацка, Оршы і Азярышча надаюцца розныя льготы. Так, мяшчане Азярышча вызваляліся на 8 год і ад замкавых павіннасцяў. У выніку ўрад браў на сябе ўвесь цяжар па ўтрыманні замка. Мяшчане Оршы ў 1582 г. таксама вызваляліся ад розных работ на карысць замка [1, с. 256, 258, 274, 277].

## Заключэнне

Падсумоўваючы сказанае, адзначым, што на працягу другой паловы XVI ст. урад так і не здолеў выпрацаваць аднастайны падыход у адбыванні замкавых абавязкаў. Нізкай была эфектыўнасць мер па супрацьдзеянні злоўжываннням

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

феадалаў і мясцовыхураднікаў. Пры адсутнасці сродкаў у скарбе ўрад імкнуўся перакласці рознага кшталту выдаткі на мяшчан. Гэта ініцыіравала заснаванне мястэчкаў пры памежных замках. Але такі падыход улады не маглі ўжыць у адносінах да ўсіх гарадоў і мястэчкаў. Таму можна канстатаваць, што пытанне пошуку сродкаў на падтрыманне баяздольнасці ўмацаванняў дзяржавы так і не было канчаткова вырашаным да канца XVI ст.

### *ЛІТАРАТУРА*


1. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. 3. – СПб., 1848. – VIII, 317, 16, 14 с.
2. ***Любавский, М.*** Литовско-русский сейм / М. Любавский. – М., 1900. – 850 с.
3. Archiwum książątLubartowiczów Sanguszków w Sławucie. – T. VII. – Lwow, 1910. – S. 433.
4. ***Любавский, М.К.*** Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно / М.К. Любавский. – М., 1915. – 401 с.
5. Lietuvos Metrika. Knyga № 52 (1569 – 1570). Užrašymų knyga 52. – Vilnius.: Moklo ir enciklopedijų leidybos institutas, 2004. – 224 p.
6. ***Довнар-Запольский, М.*** Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах / М. Довнар-Запольский. – Кіевъ, 1901. – 807 с.
7. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. 2. – СПб., 1848. III, 405, 15, 14 с.
8. ***Ткачев, М.А.*** Замки Белоруссии / М.А. Ткачев. – Мн.: Полымя, 1987. – 222 с: ил.
9. Акты Литовско-Русского государства. Вып. 1. Т. 2. – М., 1897. – XII. – 258 с.
10. Lietuvos Metrika. Knyga № 532 (1569 – 1571). Viešujų reikalų knyga 10. – Vilnius: Zara, 2001. – 155 p.
11. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 43 (1523 – 1560). Кніга запісаў 43 (Коп. М 54 канца XVI ст.) / падрыхт.: В. Мянжынскі. – Мн.: Бел. навука, 2003. – 167 с.
12. Lietuvos Metrika. Knyga № 51 (1566 – 1574). Užrašymų knyga 51. – Vilnius.: Lietuvos istorijos inst., 2000. – 485 p.
13. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. 1. – СПб., 1863. [6], 301, 15 с.
14. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 44: Кніга запісаў 44 (1559 – 1566) / падрыхт. А.І. Груша. – Мн.: Арты-Фэкс, 2001. – 229 с.: іл.
15. Белоруссия в эпоху феодализма: в 3 т. / редкол.: А.И. Азаров [и др.]. – Минск: Изд-во АН БССР, 1959 – 1961. – Т. 1: С древнейших времен до середины XVII века / сост. З.Ю. Копысский. – 1959. – 515 с.


Паступіў у рэдакцыю 20.01.2009 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова